№ 6-7 [33-34] Чэрвень-Ліпень 1950 г.

БОЖЫМ ШЛЯХАМ

Часапіс Беларускае рэлігійнае думкі.

«SUR LA VOIE DIVINE».
Mensuel religieux biélorussien.

Цана нумару 40 фр.

Адрэс рэдакцыі:
Adresse : Redaction, 51, rue des S.ts Pères, Paris (6).
Chèque Postal : Paris c. 628744.

Падпісная цана на год 350 фр.

ІДЭІ

Сучасныя падзеі ў Карэі паводля агульнае грамадзкае думкі набліжаюць разьвязку тае халоднае вайны нэрваў, якая завязалася амаль беспасрэдна пасьля сканчэньня другое сусьветнае вайны. У гэтай вайне стаяць супраць сябе ня так два блёкі дзяржаў, як дзьве ідэалёгіі: марксістоўскаматэрыялістычная і лібэральна (і дэмакратычна) — капіталістычная. І адзін і другі блёк азброены паводля найнавейшых асягнень тэхнікі і выглядае так, быццам карэйскія падзеі гэта толькі пачатак сапраўднага мераньня сілаў. Дзеля гэтага з яго робяць вельмі далёкасяглыя выснаўкі. Ня выключана, што сам карэйскі закалот зьявіўся якраз на тое, каб мець магчымасьць зрабіць рашучыя хоць і вельмі небясьпечныя манэўры.

Дзеля таго, што разьвязка карэйскае справы можа стацца пытаньнем сусьветнага значэньня, увесь сьвет прыглядаецца цяпер да Карэі вельмі ўважна і з усіх бакоў. Тэхнікі прыглядаюцца з свайго гледзішча: яны мераюць і лічаць зброю; стратэгі глядзяць на іншыя рэчы: яны лічаць людзей, параўноваюць абшар, займаюцца рознымі хітрыкамі і подступамі ў баёх і т. д. Але найважнейшы пункт гледжаньня да гэтага часу мала каму ўпаў у вока. Тымчасам для нас ён ёсьць ці не найбольш павучаючым — гэтым пунктам у карэйскім закалоце ёсьць ідэалягічнае азбраеньне ваюючых сілаў.

Да гэтага часу карэйскія камуністычныя адзьдзелы маюць колькасную перавагу ў людзях і часткава перавагу ў танках, але па-за тым амэрыканскія і саюзныя сілы маюць перавагу на сваім боку, але ня гледзячы на гэта, вось каторы час яны ня могуць стрымаць наступу камуністаў. У чым-жа справа? Агульна адказваюць: замала зброі і замала войска. Дзіўна! Гэта-ж не далей, як пару месяцаў таму ў розных газэтах і часапісах пісаліся такія прыгожыя артыкулы аб розных родах новае зброі, якая не патрабуе масаў войска, а як прыйшлося да справы, на пытаньне дзе-ж тая новая і непераможная зброя? няма яснага адказу. Ужо ад трох гадоў гаварылася аб вайне і рабілася падрыхтоўку да яе, а вось выявілася, што за гэты час капіталісты таргаваліся за розныя цэны, а падрыхтоўка ўласьціва пачынаецца толькі цяпер, дзеля гэтага стараюцца выграць на часе і надробліваць страчаны час. І гэты торг за паўнейшую кішэню цяпер мусяць аплочваць іншыя дарагою цаною крыві. Пры тым ня выключана, што тыя блізарукія, якія стараліся толькі пры гэтай нагодзе пабольшыць свой капітал, могуць яго страціць зусім, але яны загледжаныя ў залатога бажка, ня хочуць бачыць гэтае небясьпекі.

Пэўна-ж з ваеннага гледзішча можа быць вельмі разумным, каб ня выяўляць у Карэі ўсіх навейшых асягенень ваеннае тэхнікі і захаваць іх, як вялікую неспадзеванку для больш адпаведнага мамэнту. Аднак пакуль такі мамэнт настане, цяпер карыстае наступаючая камуністычная сіла, не зважаючы на сваe розныя нястачы. Адначасна іхняя спрытная прапаганда выкарыстоўвае гэты поступ для далейшае мэты, каб падарваць у масах давер да дэмакратычна-капіталістычнага блёку. І ёсьць ужо азнакі, што некаторыя дзяржавы з гэтага ўсяго пачынаюць глядзець на разьвіцьцё падзеяў даволі пэсымістычна, аднак у самой Амэрыцы не адчуваецца гэтага пэсымізму, на-

адварот там атрасаюцць з пасыўнасьці. Дзеля гэтага варта прыглянуцца да гэтае справы ўважней і пераканацца, што такі пэсымізм агулам неапраўданы; яго мейсца павінна заняць бадзёрасьць.

Карэйскія падзеі лішні раз ясна паказваюць, якое аграмаднае значэньне ў змаганьні мае ідэалягічнае азбраеньне. Камуністы наагітаваныя да засьляпленьня йдуць на ўсякія ахвяры і гоняць у бой масы і перамагаюць перашкоды. З другога боку людзі, якія найбольш спадзяюцца на тэхніку і за мала на ахвярнасьць, ня хочучы стаюцца ахвярамі і трацяць сваю тэхнічную перавагу. Бо ад вякоў ведама, што зброяю кіруе чалавек, але сам чалавек дзейнічае паводля тых ідэяў, якія парушаюць яго розум і волю.

Дзеля гэтага, што тут закранаецца філязафічнае пытаньне, варта выясьніць некаторыя словы, якія тут ужываюцца.

Гаворачы аб ідэалёгіі, разумеем пад гэтым словам цэлую сыстэму ідэяў, якія твораць нейкую праграму ці сьветапагляд. Самое-ж слова ідэя азначае паняцьце аб нейкай рэчы, ці зьявішчу ў нашым розуме. У штодзеннай гутарцы ня раз слова ідэя ўжываецца ў значэньні ідэалу — гэта значыць — найвышэйшае дасканаласьці нейкае рэчы, або як самае найдасканалейшае канцове мэты нашага імкненьня. Кажучы ясьней аб ідэалёгіі, трэба падчыркнуць, што гэта ня проста зборка ідэяў, але сувязь аднагодных, узаемна дапаўняючых сябе ідэяў, якія твораць нейкую неразрыўную суцэльнасьць. Ідэалёгія ўпарадкоўвае ідэі ў адным кірунку. Дзеля гэтага ідэалёгія, калі яна сапраўды добра ўпарадкоўвае нашы ідэі і нашае думаньне, можа даць ясны сэнс жыцьцю чалавека, паказваючы на апошнюю мэту і на спосабы яе асягненьня; яна можа мабілізаваць усе людзкія сілы, да асягненьня гэтае жыцьцёвае мэты, а тым самым яна стаецца магутным штуршком для дзеяньня. Чым розьніцца возера ад ракі, тым можа розьніцца бяз'ідэйны чалавек, ад ідэйнага. Нават вялікая маса вады ў возеры ня выканае такое працы, як выконвае нават маленькая рэчка, рэчышча якое накіравана ў млынавыя турбіны. Беспараўнаньня большую працу, чым усякія турбіны, выконваюць людзі з глыбокім перакананьнем слушнасьці свае ідэалёгіі, бо такі чалавек здольны да найбольшых ахвяраў для ажыцьцяўленьня свае ідэалёгіі. Тут аднак трэба зрабіць засьцярогу, што ня кожная ідэалёгія можа пабуджаць чалавека да ахвярнасьці. Ужо ў сівой мінуўшчыне хрысьціянскі пісьменьнік Тэртуліян (160-223) зьвяртаўся да паганскіх філязофаў з вельмі трапнаю заўвагаю, што яны нават палы свайго філязофскага плашча не ахвяруюць у абароне сваіх філязафічных сыстэмаў, тады як хрысьціяне не шкадуюць жыцьця ў абароне свае веры. У выніку гэтага хрысьціяне сталі пераможцамі, ня гледзячы на сваю слабасьць.

З усіх філязафічных сыстэмаў, якія сталіся асноваю нейкага сьветапагляду, адзіна хрысьціянства і то ў яго ерархічнай форме з Сьвяцейшым Айцом на чале для туземнае Царквы і з Хрыстом для ўсяе Царквы, мае такія крыніцы жыватворчае сілы, якія могуць зрабіць чалавека непераможным.

Вялікая шкода, што рамкі гэтага часапіснага артыкулу не даюць магчымасьці разглянуць нават у галоўных рысах няхрысьціянскія сьветапагляды, каб паказаць іхныя слабыя мейсцы, якія адчувалі нават самыя асновапаложнікі тых ідэалёгіяў. Аднак што да камуністычнае ідэалёгіі дык ужо той факт, што яна ўва ўсіх сваіх істотных пунктах прыпадобніваецца да веравызнаньня, а сама камуністычная партыя да Каталіцкае Царквы (параўн. артыкул: «Манлівая вера» ў Нр. 16-17, стр. 3), ужо тым самым сьведчыць аб яе падступнасьці. Але адначасна гэтае стараньне прыпадобніцца да хрысьціянскае рэлігіі і да хрысьціянскае ідэалёгіі ёсьць вымоўным фактам на карысьць хрысьціянскае ідэалёгіі. У вопратку слабога ніхто не пераадзяецца, калі хоча адстрашыць ворагаў. А тут перад намі факт, што ідэалёгія, якая толькі повідна прыняла рэлігійныя формы і сваю недарэчную навуку прыпадобніла да догмаў веравызнаньня — сталася магутным штуршком для чалавека. Дык якім-жа тады штуршком можа і мусіць быць самая хрысьціянская ідэалёгія?! Сорам аб гэтым прыпамінаць, але прыпамінаць трэба. Мы шукаем за рознымі навінкамі зброі, але забываемся, аб той зброі, якая ёсьць у нашых сэрцах і без якое ніякая матэрыяльная зброя нічога сама зрабіць ня зможа.

Камуністычная ідэалёгія падшываючыся пад іншыя, хавае свае нязьлічаныя супярэчнасьці і недарэчнасьці. Яна стаіць на гліняных нагах і трымаецца толькі сілаю тэрору і гвалту, цягне за сабою нязьлічаныя і жудасныя ахвяры нават у часе міру, а ў часе вайны кожную хвіліну можа заваліцца. Адно тое, што камуністы вымагаюць ад сваіх пасьлядоўнікаў для абароны і прапаганды гэтае ідэалёгіі найбольшых ахвяраў, ня выключаючы ахвяры жыцьця, быццам для нейкага шчасьця прышлых пакаленьняў, але ня прызнаюць існаваньня душы, ані загробнага жыцьця, тым самым адбіраюць усякі сэнс да гэтых ахвяраў. Такая ідэалёгія, як бура, раптам паўстае, ахоплівае вялікі абшар, нішчыць яго і руйнуе і раптам зьнікае, як толькі яе пасьлядоўнікі ацьвярозяцца ад першага захапленьня.

Толькі тая ідэалёгія можа быць вечнай і павінна стацца мэтаю жыцьця чалавека, якая можа быць асягнута кожным чалавекам на кожнай ступені культуры і ўва ўсякім веку. Такою адзінаю ідэалёгіяю ёсьць хрысьціянская, дзе кожны можа лёгка пазнаць і выконваць Божыя прыказаньні і праўды веры, належаць да Хрыстовае Царквы і за ўсе свае добрыя ўчынкі ды ахвяры асягнуць неба. У хрысьціянстве ніводзін учынак ня гіне:

і за добрыя і дрэнныя ўчынкі ў будучым жыцьці будзе разрахунак. Да таго хрысьціянства мае тое, чаго ня мае ніадна іншая ідэалёгія — гэта Божую ласку і Божую помач ува ўсякім дзеяньні, якое адказвае Божым плянам. Усё гэта кожнаму шчыраму верніку дае супакой і ўпэўненасьць канцавое перамогі.

Гісторыя сьвету аднагодна сьведчыць аб тым, што людзі з вялікімі ідэямі выходзілі пераможцамі нават з найцяжэйшага змаганьня; калі нават яны самі гінулі, дык іх ідэі знайходзілі іншых абаронцаў.

Дзеля гэтага беларуская эміграцыя павінна ўважаць сваім пачэсным абавязкам, каб азброіцца найперш у хрысьціянскі сьветапагляд, гэтым здабыць гарт духа і адначасна першую перадумову для ўсякага далейшага дзеяньня. Без папярэдняга ідэалягіянага азбраеньня нават найлепшую матэрыяльную зброю можа выбіць з рук кожны ідэйна азброены праціўнік. Нашы продкі тады перамагалі, калі да змаганьня йшлі сьпяваючы малітву. Выкарыстайма доўгі час эміграцыйнага чаканьня на аднову тэных слаўных хрысьціянскіх традыцыяў. Такі наказ і такая навука з карэйскіх падзеяў.

Л. Старавіцкі.

АБРАДЫ

Рэлігійнае жыцьцё чалавека побач захаваньня Божых прыказаньняў, праяўляецца так-жа ў выконваньні пэўных рэлігійных абрадаў. Хрыстова Царква, маючы за сабою ўжо амаль дваццацівяковую традыцыю, усталіла абрады і ў сілу гэтае традыцыі і прыпісаў Царквы, яны сёньня выконваюцца паводля пэўнае азначанае формы.

Парушаем гэтую тэму ў зьвязку з тым, што на Хрыстову Царкву ад пару дзесяткаў гадоў вядуцца ўзмоцненыя атакі, падкопваецца яе аўтарытэт і ў гэтай разбуральнай рабоце адно з першых мейсц займаюць напады на рэлігійныя абрады і на духавенства, якое гэтыя абрады выконвае. Часам гэтыя напады вядуцца яўна, але вельмі часта яны робяцца паціху, няўпрыцям для самых вернікаў, аднак заўсёды бязбожніцкая прапаганда высьмейваньне абрадаў уважае за найбольш дзейны спосаб пашырэньня сваіх уплываў. Дзеля гэтага кожнаму верніку трэба ведаць вялікае значэньне абрадаў у рэлігійным жыцьці.

Самое слова «абрад» можа мець рознае значэньне, дзеля гэтага перш, чым гаварыць аб абрадах, трэба азначыць той сэнс, у якім гэтае слова тут будзе ўжывацца. Коратка кажучы, абрад — гэта прыпісаны спосаб выказваньня пашаны Богу ў рэлігійных практыках. У гэтым сэнсе абрады ахопліваюць усе тыя вонкавыя цэрэмоніі і асьвячаныя формулы, якія беспасрэдна, ці пасрэдна лучаць чалавека з Богам. Яны ёсьць чыста людзкім вытварам, але таму, што адначасна маюць дачыненьні да Бога, карыстаюцца ўсім тым найпрыгажэйшым, што людзі маюць: словам-малітваю, сьпевам і музыкаю, жэстамі і рытмамі, абразамі і малюнкамі, сьветачамі, пасьвячанымі рэчамі і вопраткаю, сымбалямі і пад.

Зразумела, што ня ўсе абрады, якія сёньня існуюць у Царкве, аднолькава важныя. Ёсьць абрады абавязкавыя, дазволеныя, дапушчальныя і толькі талераваныя. Затое розныя забабоны, якія часта прыпадабняюцца да царкоўных абрадаў, забароненыя пад караю граху.

Цяпер спытайма сябе: нашто патрэбныя абрады, калі чалавек можа зьвяртацца да Бога беспасрэдна бяз ніякіх цэрэмоніяў? Бог-жа ня толькі ўсёзнаючы і ўсёбачучы, але і ўсюдыпрысутны, а сэрца чалавека можа быць найпрыгажэйшаю сьвятыняю Сьвятога Духа, дык якія-ж яшчэ патрэбны абрады, каб зьвяртаць гэтае сэрца да Бога і славіць Бога?

Земляроб на гэткае пытаньне мог-бы адказаць іншым пытаньнем: Нашто ўгнойваць ніву, араць ральлю, баранаваць, пераворваць, засяваць яе найлепшым і найкаштаўнейшым насеньнем, даглядаць гэтую ніву, каб атрамаць збожжа на штодзенны хлеб, калі побач нівы на сенажацях бяз ніякіх турботаў з боку земляроба расьце спакойна мурожная трава? Падобна і сэрца чалавека, на тое, каб яно сапраўды сталася сьвятыняй для Бога, вымагае дзеля гэтага дбайлівае працы.

Чалавек — гэта ані бяздушная жывёла, ані чысты дух — ангел. Чалавек складаецца з душы і цела, дзеля гэтага свае духовыя акты выяўляе навонках рознымі матэрыяльнымі знакамі, якім надае пэўны ўмоўлены сэнс. У прыродзе ёсьць нязьлічаныя цудоўныя выявы ўслаўленьня Стварцы нават неразумнымі жывёламі: вясною найлепшыя сьпевакі птушынага сьвету, як: жаўранкі, каролікі, дразды, канарэйкі, салаўі і інш. штораніцы і штовечара на ўсе лады трыляць прыгожыя гымны бяз ніякіх абрадаў; і каму-ж яны іх сьпяваюць, як не на чэсьць свайго Стварцы? А людзі? хіба-ж яны могуць быць абыякавымі ў адносінах да свайго Стварцы? Людзі будуюць прыгожыя сьвятыні, прыкрашваюць іх найлепшымі творамі мастацва, і ў гэтых сьвятынях зьбіраюцца ўслаўляць Бога паводля прынятых звычаяў. Чалавек істота ня толькі разумная, але і грамадзкая, таму аддае чэсьць Богу ня толькі асабіста, але і ў грамадзкай форме.

Агульна ведама, што чым жывейшая вера ў сэрцы чалавека, тым акуратней ён захоўвае абрадовыя прыпісы Царквы для ўслаўленьня Бога. У гэтым сэнсе абрады могуць быць добрым паказчыкам веры чалавека. Ідучы далей, можна заў-

важыць, што абрады могуць быць так-жа азнакаю жывучасьці і праўдзівасьці Хрыстовае Царквы. Падобна, як здаровае дрэва пазнаецца па гальлі, лісьцю, кветках і па тым, колькі яно прыносіць овачаў, так рэлігійныя абрады могуць быць да пэўнае ступені паказчыкамі тае Царквы, у якой крынічаць жыватворчыя сокі Хрыстовае ласкі. Абцерабеце гальле з дрэва, паабсморгвайце лісьце і кветкі і ня дайце магчымасьці вырасьці новаму лісьцю, сьсякнуць у ім жыватворчыя сокі, дрэва змадзее і засохне. Абцерабеце рэлігію ад абрадаў — змалае вера, створыцца прыдатны грунт для абыякавасьці, а там і бязбожнасьць недалёка. Вось чаму бязбожнікі так зацікаўлены абцярэбліваць абрады, або асьмешваць іх у форме розных забабонаў.

Прыглянуўшыся форме і зьместу абрадаў, можна лёгка ўбачыць, што яны маюць глыбокае апраўданьне ў натуры чалавека. Як перш было ўспомнена, чалавек складаецца з душы і цела, таму ён мусіць аддаваць чэсьць свайму Створцу і духам і целам. Кожнаму-ж добра ведама, што нашы ўнутраныя пачуваньні мы выяўляем навонках нейкімі бачнымі знакамі: любоў — усьмешкамі, пацалункамі, дарункамі; прывітаньне — зьняцьцем галоўнага ўбору, руканьнем, добрымднём; гнеў — паднятым голасам, пагрозьлівымі жэстамі; прыход на сьвет дзіцяці — хрэсьбінамі; шлюб — вясельлем; сьмерць — хаўтурамі; словам усё жыцьцё чалавека нават у чыста бытавых праявах суправаджаецца рознымі абрадамі, дык як-жа рэлігійнае жыцьцё можа бяз іх абыйсьціся?

Форма абрадаў у асноўным мае на мэце ўзрушыць сэрца чалавека, адчыніць яго і настроіць прыязна для свайго бліжняга, а рэлігійныя абрады імкнуцца адчыніць сэрца чалавека для дзеяньня Божае ласкі. Так як для атрыманьня ўраджаю трэба добра падрыхтаваць ніву, падобна і для духовага жыцьця трэба парушыць людзкое сэрца, а гэта абыякім дзейнікам зрабіць немагчыма. Вельмі трапна казаў калісь М. Багдановіч да маладых песьняроў:

Ведай, брат малады, што ў грудзёх у людзей
Сэрцы цьвёрдыя, быццам з каменьня.
Разаб'ецца аб іх слабы верш заўсягды,
Ня збудзіўшы сьвятога сумленьня.

Гэтую праўду нават шэрыя народныя масы ведалі ўжо ад вякоў і тварылі некаторыя бытавыя абрады і звычаі, якія могуць парушыць найбольш закамянелае людзкое сэрца. У беларускіх бытавых звычаях такіх абрадаў ёсьць нямала. Успомніць хоць-бы такое агульнае багаслаўленьне маладых перад шлюбам, саджаньне маладое на пасад і інш., якія амаль усіх прысутных узрушваюць да сьлёз.

Тымбольш, зразумела, патрэбна абрады ў рэлігійным жыцьці. Богу абрады непатрэбны, але яны патрэбны чалавеку, каб адарваць на хвіліну людзкую думку ад будзённага жыцьця і ўзьняць яе да Бога, каб адначасна там знайсьці пацеху і суцяшэньне, асабліва калі сэрца прыгноблена якімі цярпеньнямі. І шчасьлівы той чалавек, які карыстае з гэтых дабрадзействаў. Калі такому чалавеку здарыцца якое няшчасьце, ён нясе яго ў сьвятыню, кленчыць перад сьвятым абразом; і з шчырымі словамі малітвы плыве адначасна з цудоўнымі царкоўнымі мэлёдыямі часам горкая сьляза, а з ёю выліваецца ўвесь цяжар, боль і прыгнобленьне. Ён сьведамы, што ані ягоны боль, ані цярпеньне, ані сьлёзы — нічога ня гіне: рэлігія зьбірае іх у свае скарбніцы і заносіць іх рознымі сымбалічнымі абрадамі перад пасад Усявышняга. Колькі суцяшэньня, колькі сілы дае такая малітва аб гэтым ведае той, хто сам перажываў такія мамэнты.

Пажары, эпідэміі, войны, паводкі ды назьлічаныя іншыя няшчасьці — не абмінаюць ніводнае краіны і ніводнага чалавека, але яны не палохаюць тых, хто моцна верыць, што ў яго парахвіяльнай сьвятыні на аўтары ў Найсьвяцейшай Эўхарыстыі ёсьць Сам Хрыстос, што Ён заўсёды блізкі да кожнага чалавека, а калі станецца якое няшчасьце, дык Ён падзяляе яго з цярпячым людзкім сэрцам.

Калі-б пачаць наводзіць доказы з Сьвятога Пісаньня аб патрэбе рэлігійных абрадаў, дык з гэных сказаў паўстала-б цэлая кніжка. У Старым Запавеце было шмат абрадаў і ўсе яны былі дакладна азначаны Майсеем пад натхненьнем Самога Бога. Але ўжо прарокі адназгодна прадвяшчалі адмену старавеетных абрадаў. У Новым Запавеце Хрыстос на пачатку свайго навучаньня казаў: «Прыйдзе час, дый ён ужо прышоў, калі праўдзівыя паклоньнікі будуць пакланяцца Айцу ў духу і праўдзе, бо гэткіх паклоньнікаў шукае сабе Айцец» (Ів. IV, 23). Гэтым найвыразьней выказаў Хрыстос, што ўсе старыя абрады юдэяў, самарытанаў і паганаў заменяцца новымі абрадамі, якія будуць асновавы на праўдзівым паняцьці Бога. Старазаветныя абрады юдэяў палягалі на бяздушных ахвярах жывёлаў і вонкавых цэрэмоніях; цяпер-жа Хрыстос зазначае, што Бог ёсьць дух і Яму патрэбны чыстыя духовыя ахвяры, якімі ёсьць добрыя ўчынкі, добрыя намеры. шчырыя акты веры, надзеі, любові ды іншыя цноты; новазаветныя абрады маюць спамагаць у гэтым кірунку людзкое сэрца.

Асноўныя формы сучасных абрадаў падаў Сам Хрыстос адначасна з устанаўленьнем сьв. Тайнаў. Пасьля ўстаўленьня на Тайнай Вячэры сьв. Эўхарыстыі, Хрыстос загадаў апосталам: «Рабеце гэта на ўспамін аба Мне» (Лук. XXII, 19). Выбіраючы апосталаў, Хрыстос устанаўляе сьв. Тайну Сьвятарства, а даючы ім уладу адпу-

шчаць і затрымоўваць грахі — устанаўляе сьв. Тайну Споведзі (Ів. XXII, 21-23). Перад тым, як пасылаць апосталаў у сьвет, Хрыстос устанавіў сьв. Тайну Хрышчэньня (Мат. XXVIII, 19). На вясельлі ў аднаго з вучняў у Кане Галілейскай Хрыстос устанавіў сьв. Тайну Сужэнства і т. д. Сымбалічнае значэньне абрадовым цэрэмоніям даў Хрыстос, умываючы апосталам ногі (Ів. XIII, 4-15).

Апосталы верныя запаветам Хрыста ўва ўсіх сваіх учынках стараліся ўсё рабіць так, як рабіў іх Настаўнік. Калі-ж рэлігійнае жыцьцё разрасталася і вымагала новых формаў, дык гэтыя формы выраслі з духу Хрыстовае навукі і толькі гэткія, згодныя з духам Хрыстовае навукі, абрады пераходзілі ў традыцыю, узаконьніваліся Царквою і перадаваліся з роду ў род, з веку ў век. Сучасная Хрыстова Царква мае сапраўдныя скарбы абрадаў, з якіх людзі рознага веку, розных нацыяў, рознае ступені асьветы і культуры — кожны адпаведна да сваё патрэбы і свайго духовага ўзроўню можа знайсьці паважную падтрымку свайго духовага жыцьця.

У сучасных царкоўных абрадах ёсьць вялікая колькасьць сымбаляў, але гэта вынікае з духу новазаветных абрадаў, якія ёсьць вонкавым выяўленьнем унутранага, духовага імкненьня чалавека да Бога. Дзеля гэтага, каб сапраўды належна апаніць і карыстаць рэлігійнымі абрадамі, трэба іх перш добра пазнаць. Хто іх пазнае, той знайходзіць вялікія скарбы для свайго духовага жыцьця. І толькі той робіць закіды супраць абрадаў, хто іх ня знае, як сьлед і ў каго духовае жыцьцё замерла зусім.

а. Леў.

ТЫ І ЯНА

(Працяг 12-ы).

Разьдзел 9-ы.

СЯБРОЎКА ЖЫЦЬЦЯ.

Для сямейнага шчасьця ў сужэнстве рашаючае значэньне мае добры выбар сяброўкі жыцьця. Гэта-ж выбар на ўсё жыцьцё, а яго наступствы прыносяць багаславенства або пракляцьце ня толькі дзецям і ўнукам, але агулам усім нашчадкам.

Ужо раней успаміналіся вельмі трапныя словы Колёна: «У жыцьці мужчыны ёсьць мейсца толькі для дзьвёх жанчын: для ягонай маткі і для маткі ягоных дзяцей». Не сказаў: «Для маткі і для жонкі», бо мужчына ў сваей сужонцы павінен бачыць у першую чаргу матку сваіх дзяцей, а ня тое, чым яна ёсьць для яго самога. Галоўнай мэтай сужэнства ёсьць павялічэньне людзкога роду. Дзеля гэтага мужчына пры выбары сяброўкі жыцьця павінен зьвяртаць увагу перадусім на тое, каб з гэтай сувязі магло вырасьці здаровае і добрае патомства. Кіруючыся гэткім паказьнікам, сам асабіста нічога ня губляе; наадварот, мае толькі карысьць, бо такі падыход да справы рашае аднача сна і аб ягоным асабістым шчасьці, а да таго мае яшчэ тую прыгожую старонку, што яго забясьпечыць перад уплывам іншых дзейнікаў, каторых значэньне для шчасьця ў сужэнстве, або для патомства ёсьць або вельмі малое, або і зусім ніякае.

Пару дзесяткаў гадоў таму паўстала асобная галіна, навукі, якая займаецца вывучэньнем спадковасьці, гэта значыць усім тым, што перадаецца ў спадчыне з пакаленьня ў пакаленьне. Гэтая навука даходзіць да цікавых вынікаў.

Спадковасьць не абмяжоўваецца толькі вонкавымі прыметамі, як форма цела, выгляд твару, вачэй, носа і пад., але яна так-жа мае ўплыў на здольнасьць, даравітасьць і нахілы ў духовым жыцьці. Ня можа тут быць гутаркі аб перадаваньні прыметаў душы; гэта ёсьць немагчымым, бо душа бярэ свой пачатак беспасрэдна з рук Божых і моцай Бога даецца кожнаму новаму чалавеку. Але для праяўленьня свае дзейнасьці душа патрабуе цела быццам інструманту і вельмі залежыць ад яго ўдачы. А прыметы цела ня ёсьць вынікам прыпадку, але кіруюцца правамі спадковасьці. Яны залежаць ад тых прыродных здольнасьцяў, якія дзіця атрымала ад бацькоў. Кожны зародак жыцьця атрымоўвае ад сваіх бацькоў некаторыя нахілы і прыметы, якія перадаюцца з роду ў род. Гэта быццам багацьце данага роду, бо яны ёсьць спадчынай найдалейшых продкаў.

Трэба аднак заўважыць, што ня ўсе прыметы і ўласьцівасьці пераходзяць ад бацькоў да дзяцей, бо перад апладненьнем зародку адбываецца дзіўны працэс дасьпяваньня насеньня, падчас якога рэдукуецца частка насеннага ядра. Дзеля гэтага ярды дасьпелага насеньня няпоўныя (зрэдукаваныя). І толькі пры спалучэньні дзьвёх рознаполых разродчых каморачак паўстае адна цэлая разродчая каморачка, якая дае пачатак новаму арганізму. Гэтак можна растлумачыць нязьлічаныя рознавіднасьці ў той самай сям'і, бо ня кожнае дзіця атрымоўвае роўны ўдзел спадчыны свайго роду, але ў аднаго выяўляюцца адны азнакі, а ў другога іншыя. Трэба аднак падчыркнуць, што кожнае дзіця можа мець толькі тыя азнакі, якія яму перадалі бацькі, а тым самым яны іх мусілі мець. Добрыя прыметы і здольнасьці бацькоў, перанятыя ад продкаў, павінны перайсьці да нашчыдкаў. Таму спадчына можа прыносіць багацьце шляхотных уласьцівасьцяў. але можа быць так-жа затручанай крыніцай страшэннага

зла, творачы фізычныя і маральныя калекі, павялічваючы на сьвеце лік вырадкаў і лік перадчасна ўміраючых.

Варта толькі разглянуцца вакол сябе з адчыненымі вачыма, каб пераканацца ў праўдзівасьці гэтых навуковых выснаўкаў. Найбольш ведамыя і здольныя людзі заўдзячваюць свае вынятковыя здольнасьці шчасьліваму спалучэньню добрых якасьцяў бацькі і маткі. Няма сумніву што для таго, каб абудзіць і належна разьвіць дрэмлючыя здольнасьці, атрыманыя ў спадку, патрэбна мець належнае ўзгадаваньне. Спрыяючыя абставіны так-жа нямала прычыняюцца да праяўленьня і поўнага разьвіцьця здольнасьцяў. Гэтым высьняецца, што часам дарагая спадчына выяўляецца ў далейшых пакаленьнях, калі заіснуюць умовы спрыяючыя для яе разьвіцьця. Амаль заўсёды здольнасьці выдатных адзінак былі ўжо ў іх продкаў, а праяўляліся ў патомках.

Але можа быць і дрэнная спадчына там, дзе якіколечы хвараблівы нахіл трапіў у сокі родавага дрэва сям'і. Няма сумніву, што прыметы набытыя чалавекам не перадаюцца ў спадку. Нармальны чалавек, калі зыйдзе з добрага шляху жыцьця, гэтым яшчэ ня нішчыць спадчыны свайго роду, але перадае яе сваім нашчадкам. Аднак з другога боку, як паказвае дасьведчаньне, атрутныя рэчавіны псуюць добрыя якасьці, а тым самым абядняюць спадковыя здольнасьці; праз гэта патомства можа зусім вырадзіцца. Так забойча можа дзеяць алькаголь, спрычыняючы ідыятызм, падачку ды іншыя нэрвовыя і ўмысловыя забурэньні. Найсумнейшым ёсьць тое, што затрачаных здольнасьцяў нельга ўжо вярнуць для спадчыны роду, а на іх мейсца стаюцца спадковымі хвараблівыя нахілы. Атрыманыя гэткім чынам нахілы ёсьць нявылячальныя, хаця добрае узгадаваньне можа іх крыху злагодзіць. Звычай на аднак ўзгадаваньне, якое даюць недаразьвітыя бацькі і бацькі са спадковымі ненармальнасьцямі, мае шмат да жаданьня, а прыродныя нахілы, прыклады, акружаючае асяродзьдзе, дзеюць якнайгорш на дарастаючае пакаленьне.

Навука, якая займаецца спадковасьцю, падае весткі аб родах запачаткаваных вырадкамі. Малюнак сапсуцьця і ліха ў такіх родах застрашаючы. У Амэрыцы прасьледжана жыцьцё 709 нашчадкаў нейкай Ады Юкес; між імі налічана: 64 вар'ятаў, 174 распусьніцаў, 196 байструкоў і 77 крамольнікаў: сярод якіх 12 забойцаў; 142 утрымоўвала грамадзкая апека.

Асабліва павучаючая гісторыя двох скрыжаваных сямейных пнёў: Адзін малады чалавек з добрае сем'і ў часе ваеннае службы зьвёў недаразьвітую дзяўчыну, пасьля чаго пакінуў яе на ласку жыцьця, а сам пазьней добра ажаніўся. Гэткім чынам даў пачатак двом розным родам. І вось абраз! Нашчадкі з нармальнага сужэнства ў ліку 409 былі бяз вынятку нармальнымі людзьмі, а нават былі між імі выдатныя адзінкі. Затое плод граху — недаразьвіты хлапец, якога радзіла зьведзеная дзяўчына, даў пачатак іншаму роду, у якім нахілы маткі не пераставалі шырыць зьнішчэньне і сярод прасьледжаных 480 нашчадкаў было: 143 недаразьвітых, 46 нармальных, рэшта або былі няведамыя, або няпэўныя, але між імі знайшлося 8 уласьнікаў дамоў распусты, 24 горкіх п'яніцаў, 33 маральна ўпаўшых і 3 злачынцаў.

Калі возьмецца пад увагу гэткае сямейнае раздваеньне, выходзячае ад аднаго бацькі, з каторага адна галіна выдала блізу ўсіх здаровых і мужных, а другая дала няшчасьнікаў і злачынцаў, дык зразумеем, якое мае вялікае значэньне для будучых пакаленьняў выбар сяброўкі жыцьця.

Хоць-бы толькі адзін раз у здаровы пень ушчэплена хворую галінку, яна здолее спрычыніць мноства няшчасьця на цэлыя пакаленьні.

Малады мужчына, які мае на ўвеце залажыць сямейнае вогнішча, павінен добра сабе ўявіць, якую бярэ на сябе адказнасьць перад будучымі пакаленьнямі. Ён мае абавязак чэснага жыцьця і павінен сьцерагчы добрае спадчыны свайго роду. Гэтая адказнасьць дыктуе яму належную асьцярожнасьць пры выбары жонкі, каб праз добрую матку перадаць дзецям толькі добрыя прыметы.

Маці мае перад сабой яшчэ іншае заданьне, для яго зразуменьня трэба ведаць, што акрамя прыродных здольнасьцяў, ў ацэнку вартасьці будучага чалавека ўвайходзяць яшчэ іншыя дзейнікі. Розныя уплывы могуць дзейнічаць або карысна, або шкодна ў разьвіцьці агульналюдзкіх ці спэцыяльных талентаў. Унутраныя перажываньні маці могуць паважна дзеяць на дзіця, якое спачывае ў яе ўлоньні. Тое, што трывожыць і разьдзірае сэрца маці, або тое, што ўздымае і цешыць яе, уплывае на вельмі далікатную нэрвовую сыстэму дзіцяці. Шляхотныя, добразычлівыя і паважныя думкі добрай і пабожнай маці бяз сумніву адаб'юцца карысна на яе дзіцяці. Зусім інакш уплывае на характар дзіцяці тая маці, якая, будучы ў паважным стане, кіпіць злосьцю і нянавісьцю, ня церпіць нікога і нічога, дае волю ўсім сваім пажаданьням.

Дык няма ў тым нічога дзіўнага, што дзеці, каторыя ў кнізе мэтрыкаў ня маюць імені бацькі, праяўляюць толькі паганых нахілаў. Стан душы маткі, грэшныя пажадлівасьці, неакелзаныя хаценьні, або сполах перад аганеньнем і дакор сумленьня, дзейнічалі разбураюча на дзіця ў яе лоне і выціснулі на маладым ягоным мазгу незацёртае таўро.

Таму ёсьць вельмі важнай справай, каб малады чалавек шукаў для сваіх дзяцей такое маткі, з сэрца каторай уліваліся-б ў сэрцы нашчадкаў толькі любоў, дабрата, пабожнасьць, мужнасьць, супакой і усё тое, што сапраўды вартаснае для чалавека.

Далей, у асаблівы спосаб узгадаваньне дзяцей у першых гадох жыцьця належыць да маткі. А ўжо хіба ня трэба паясьняць важнасьці ўзгадаваньня дзіцяці, бо-ж агулам ведама, што ўсё прысвоенае ў маладых гадох астанецца на ўсё жыцьцё, «Чым гаршчок накіпіць, тым і пахне», і наадварот: чаго чалавек не здабыў ззамаладу, тое трудна будзе знайсьці праз усё жыцьцё. Ды як можа чалавек даць іншым тое, чаго сам ня мае? Як можа даць добрае ўзгадаваньне дзіцяці тая, якая сама гэтага ўзгадаваньня ня мае? Адгэтуль і прыказка паўстала: «Якая матка, такое й дзіцятка».

Калі ўсё гэта разважым і падумаем, якім чынам у бальшыні выпадкаў робяцца заручыны, дык сапраўды трэба дзівіцца, што маладыя людзі з гэткім лёгкадумствам падыходзяць да так важных для іх і для іх патомства справаў. Калі земляроб падрыхтоўвае ніву, дык перш вынішчае на ёй пустазельле, якое магло-б заглушыць насеньне збожжа, адбіраючы яму патрэбныя сокі. Ён такжа выбірае для севу найлепшае насеньне. Ці-ж людзі з сужэнствам, — дзе важыцца жыцьцё і шчасьце чалавека, яго нашчадкаў і ўсё тое, што на зямлі найдаражэйшае — не павінны паступаць прынамся з такой самай разважнасьцю? І трэба спадзявацца, што ў гэтым выпадку не пашкадуюць ніякае ахвяры, каб аддаліць усё магчымае, што перашкаджала-б мець дзяцей найбольш даравітых. Гэта абавязак сэрца і сумленьня кожнага сумленнага чалавека.

Пры заручынах нельга рабіць выбару, кіруючыся зусім малаважнымі і другараднымі асабістымі карысьцямі, або яшчэ горш кіруючыся пажадлівасьцю. Дабро патомства павінна пераважаць усе іншыя меркаваньні. Калі-ж даведаецца, што з плянаванага сужэнства паводля ўсіх верагодных азнакаў можна спадзявацца дрэннас спадчыны для дзяцей, дык дзеля спакою свайго сумленьня ён павінен зрабіць ахвяру з сваіх пачуцьцяў сэрца, а так-жа з іншых карысьцяў.

Ведаючы аб правох спадковасьці малады чалавек у выбары сяброўкі жыцьця павінен упэўніцца найбольш бесстаронна, ці ня бачыць у той сям'і, у якой мае на прымеце будучую жонку, якогась спадковага абцяжаньня, які там інтэлектуальны ўзровень, якія маральныя і рэлігійныя пагляды. Трэба так-жа добра пазнаць асабістыя якасьці і прынцыпы дзяўчыны, каб ведаць, ці можна будзе разьлічаць на суладнае жыцьцё з ею. Агульна ведама, што ў характары жанчыны маецца шмат патрэбнага, каб у жыцьці датарнавацца да абставін і, што жанчына аднosна лёгка зжываецца з рознымі тэмпэрамэнтамі і ўмее ўзгодніць з імі свае паводзіны. Але найважнейшым для добрай сужонкі і маткі (не гаворачы ўжо аб патрэбным да гэтага пакліканьня здароўі) ёсьць сапраўды хрысьціянскае ўзгадаваньне, якое садзейнічае да разьвіцьця і афармленьня ўсіх тых цнотаў, якія патрэбныя для таго, каб стацца вернай сужонкай і шчырай маткай.

На некаторыя вельмі важныя мамэнты жадаем зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Зусім слушна бацька завецца галавою сям'і, талы калі маці — яе душою. А душа павінна быць пабожная. Таму малады чалавек у дзяўчыны, якую мае на прымеце, павінен шукаць праўдзівай пабожнасьці. Для яго самога, а так-жа і для яго дзяцей глыбокая пабожнасьць жонкі ёсьць зарукай шчасьлівага жыцьця. Няма сям'і бяз турботаў, цярпеньняў і дасьведчаньняў! Але ў гэтых няшчасьцях толькі пабожная душа знойдзе спосаб у гэтыя цяжкія мамэнты не заламацца пад іх цяжарам.

Таму вельмі ня радзяцца мяшаныя сужэнствы. Для верную чага каталіка ёсьць асноўнай праўдай, што Царква аснованай Хрыстом ёсьць ягоная Царква. Іншыя рэлігійныя спалучэньні, як-бы яны сябе прыгожа не называлі, адкалоліся ад Яе і астаюцца на фальшывай дарозе.

Праўдай ёсьць, што тыя, якія без свае віны знаходзяцца навонках праўдзівае Царквы, могуць збавіць сваю душу, калі толькі ў жыцьці кіруюцца сумленьнем, але яны ня ёсьць на шляху, які з волі Бога проста вядзе да неба. Як адзін Бог на небе, так ёсьць адна праўдзівая рэлігія і адна праўдзівая Хрыст. Кат. Царква. І нельга сабе ўявіць сямейнага шчасьця з сужонкай, якая адносіцца няпрыхільна да гэтай Царквы.

Умоваю сапраўднага шчасьця ў сужэнстве ёсьць лучнасьць душаў. Але ці-ж гэтая лучнасьць магчымая там, дзе розныя пагляды на Бога і рэлігію? Дзе розныя перакананьні аб рэлігійным жыцьці? У цяжкіх жыцьцёвых бурах сапраўдную пацеху можна знайсьці толькі ў рэлігіі. Асабліва больш чульлівае жаночае сэрца шукае тых чыстых крыніцаў пацехі, з якіх сама сябе падтрымоўвае і находзіць падтрымку для мужа і дзяцей.

Але яшчэ больш у мяшаных сужэнствах трэба баяцца за дзяцей. Узгадаваньне пераважна знайходзіцца ў руках маці. Ад яе дзіця атрымоўвае першыя рэлігійныя веды. Яе пабожныя напамінаньні і навучаньні павінны апірацца на катэхізьме, яна павінна глыбока ўшчапляць у маладую душу хрысьціянскі сьветапагляд. Як-жа гэта зробіць тая матка, якая сама нічога ня мае? Які будзе сумны для дзіцяці той дзень першага сьвятога Прычасьця, калі ягоная матка не падзеліцца з ім тым шчасьцем! Пагубныя наступствы мяшаных сужэнстваў аднosна дзяцей паказвае той факт, што яны адбываюцца бястурботна і без царкоўнага шлюбу. Як правіла ў гэткіх сужэнствах няма рэлігійнага ўзгадаваньня дзяцей і ўжо ўнукі, а тымбольш праўнукі бываюць страчаныя для праўдзівае веры. Пераглядаючы радаводы мяшаных сем'яў, заўсёды можна бачыць, як гэтая мешаніна вядзе да адпаду ад Хрыстовае Царквы і да затраты веры.

Трэба яшчэ зьвярнуць увагу, што некаталікі

уважаюць разводы за рэч дапушчальную, а тым самым вельмі развальняецца захаваньне шостага Божага прыказаньня: ня чужалож. Агулам выкананьне рэлігійных практыкаў у мяшаных сужэнствах вельмі абцяжваецца. Дзеля гэтага зразумела, што каталіцкая Царква ўважала патрэбным станоўка выступіць супраць такіх сужэнстваў. Неаднолькавасьць рэлігіі ёсьць адною з важных перашкодаў царкоўнага права. А такое мяшанае сужэнства, ў якім ёсьць небясьпека зусім страціць веру забараняецца так-жа правам Божым. У абліччы гэткіх небясьпекаў лепш ня шукаць дазволу для мяшанага сужэнства, але шмат лепш падпарадкавацца тым вымогам і радам, якія ў гэткіх выпадках даюць духоўныя ўлады.

Беручы пад увагу здароўе патомства, трэба зьвярнуць яшчэ ўвагу на сужэнства ў недалёкіх ступенях спародненьня. Здараецца ў некаторых родах, што там ёсьць нейкае паважнае даляганьне, якое перадаецца ў спадку, але датуль астаецца бяз уплыву, пакуль адзінкі гэтае сям'і жэняцца з несваякамі. Калі аднак здарыцца сужэнства паміж спародненымі, тады хваравлівыя зародкі лучацца і могуць выклікаць розныя няшчасныя наступствы, як: перадчасную сьмяротнасьць дзяцей, няплоднасьць, або яшчэ што горшае. У сужэнствах з падвойным спародненьнем, гэта значыць, дзе ўжо ў лініі продкаў раней былі сужэнствы з сваякамі, там нашчадкі зьяўляюцца больш блізкімі да сябе і ў выпадку іхняга сужэнства ў недалёкіх лініях спародненьня можна спадзявацца тым горшых наступстваў, чым у бліжэйшай ступені былі-б нарачоныя. Сумныя наступствы такіх сужэнстваў можна бачыць у тых вёсках, дзе звычайна адбываюцца сужэнствы ў межах тае самае вёскі.

Шмат даляганьняў і нават хваробаў перахазваных у спадку любіць таіцца, таму выявіць іх немагчыма, дзеля гэтага царкоўная забарона сужэнстваў у блізкіх ступенях спародненьня паводля аднагоднага сьведчаньня сучасных навуковых аўтарытэтаў ёсьць вельмі мудраю.

У нашых часох можна пачуць галасы, каторыя дамагаюцца перад сужэнствам пасьведчаньня сумленнага лекара, падцьвярджаючага здароўе абодвых нарачоных. У шматлікіх выпадках такім чынам можна было-б усьцерагчыся ад горкіх расчараваньняў і прыкрых цярпеньняў, каб паслухаць гэтае мудрае і зусім абаснаванае рады.

Да іншых умоваў перад сужэнствам трэба залічыць бяз закіду чыстае жыцьцё. Ужо гаварылася вышэй аб тых шкодах, якія спрычыняе нясьпелае каханьне. А цяпер падумайма, ці дзяўчына з абцяжаным мінулым зможа ўзгадаваць дзяцей так, як належыцца, калі сама такога ўзгадаваньня ня мае? Ці яна зможа стацца душою сям'і? Куды пацягне яе сэрца? Ці зможа адрачыся дрэнных кнігаў, ліхога кіна і паганых тэатраў?

Для шчасьлівага сямейнага жыцьця неабходна, каб адзін другога разумеў і любіў. Вялікія розьніцы ў асьвеце, узгадаваньні і паглядах часта ёсьць перашкодай, каб сужонкі добра з сабою зжыліся. Той, хто лепш узгадаваны, ня раз будзе прыкра адчуваць нястачы выхаваньня і добрых манераў свайго сябры жыцьця. Дзеля гэтага ня ёсьць неразумным вымаганьне роўнасьці стану сужонкаў. Аднак у пэўных абставінах выняткі з гэтага вымаганьня могуць быць, дзеля гэтага такое вымаганьне варта цаніць, як раду, а не як перашкоду.

Гаворачы аб праўдзівай любові, мы не разумем тут тае палкасьці закаханых, што часта астыўшы, выраджаецца ў няпрыязьнь і нянавісьць, але тое глыбокае ўзаемнае сяброўства, каторае асноўваецца на ўзаемным разуменьні і праяўляецца ў жаданьні рабіць адзін аднаму добра. Такая любоў ня шукае ў першую чаргу сябе і свае карысьці, але дабра другога. Гэтая любоў цалкам дае дасць любаму тое, што яму прынясе дабро і шчасьце.

Трэба памятаць, што чалавек не заўсёды найбольш любіць тых, ад каго атрымоўвае шмат дарункаў, або тых, якія выконваюць усе ягоныя жаданьні, але часьцей тых, для каго сам трудзіцца і пацее і каторым сам робіць добра. Калі прыкладам муж занадта стараецца дагадзіць жонцы і выконвае ўсе яе найменшыя жаданьні, дык лёгка можа дайсьці да таго, што яна перш будзе прымаць усё разумна, але пасьля пачне дамагацца гэтага, як нечага, што ёй належыцца, і ня прыйдзе ёй нават у галаву, каб падобнай дбайлівасьцю адплаціць мужу. Калі гэта муж адчуе і час ад ачсу пакажа на гэта пальцам, дык настае раздваеньне. Расьпешчаныя людзі звычайна бываюць няўдзячнымі і за вялікую дбайлівасьць плоцяць абыякавасьцю і наравістасьцю. Праўдзівая любоў не заўсёды мае праяўляцца ў спаўненьні жаданьняў любае асобы; наадварот, часам трэба сапраўды вялікае любові, каб любаму нечага адмовіць. Толькі тады, калі абое ўсьцяж робяць бескарысна ўсё магчымае дзеля ўзаемнага дабра, любоў магутнее і становіцца глыбейшай.

Бескарыснае любові трэба вучыцца. Сама яна ня прыйдзе. Сілы для яе здабыцьця знайходзяцца ў ціхім і ахвярным выконваньні абавязкаў, трывалым перамаганьні самога сябе і ахвотнай паслухмянасьці бацьком.

Аб усім тым, што вышэй сказана, трэба думаць перш, чымся «закахаўся», бо калі гэтае славутае «каханьне» ўжо сталася, дык яно можа так засьляпіць чалавека, што ён будзе перакананы аб вечным трываньні свайго пачуцьця і аб сапраўднасьці ўсіх уяўных нябесных прыметаў каханае асобы. «Бура каханьня, — як кажа адзін лекар, — мароччыць развагу, засьляпляе вочы на найбольш яўныя дрэнныя нахілы, усё ўбірае ў вясёлкавыя колеры і прысланяе сапраўдную вартасьць аднаго перад другім. Калі праміне першы

бурлівы час быццам ненасытнага пажаданьня, калі праміnуць мядовыя месяцы, прыходзіць час цьвярозасьці, а з ім сапраўдная любоў, або абыякавасьць, ці нават нянавісьць, або мяшанка ўсіх гэтых пачуцьцяў, ствараючая нейкія магчымасьці для сужыцьця. Таму гвалтоўныя закаханьні заўсёды падазронныя і толькі даўжэйшае, глыбейшае знаёмства абодвых перад сужэнствам можа даваць надзею на трывалую і шчасьлівую сувязь».

Адгэтуль асьцярога маладому чалавеку, каб быў паўстрыманым, калі пачуе ў сабе першы подых каханьня. Тады трэба канешне захаваць нескаламучаную сьведамасьць сябе, каб пачуцьцё не заняло сэрца бурлівым полымем, не замуціла розуму і ня спутала волі. Жыцьцё паказвае, што маладыя закаханыя трапляюць у такі стан, у якім ані самі ня могуць спакойна разважаць, ані ня слухаюць разумных заўваг іншых. Агулам трапна кажацца «Каханьне асьляпляе». Пры гэтым вельмі часта тымі прыметамі, якія нязвычайна пацягваюць, ёсьць выключна вонкавыя прыметы, як: голас, валасы, позірк, або нават прыгожая вопратка. Слушна заўважвае адзін з сучасных псыхалёгаў, што сёньняшняя мода мае на мэце не забясьпечыць чалавека перад кліматам, але каб зрабіць яго прывабным. Ведаючы аб гэтым, малады чалавек павінен навучыцца трымаць воддаль сваё сэрца ад падобных прывабаў, каб яны не завялі яго ў палон. Ад вякоў ведама, што «Дай сэрцу волю, завядзе ў няволю». Дзеля гэтага так трэба абходзіцца з жанчынамі, нават з тымі, каторыя падабаюцца, каб не паддацца пацягам інстынктаў; асабліва адкінуць стараньне ім падабацца. Толькі тады магчыма здолее цьвяроза разважыць: ці дзяўчына, да каторае хіліцца яго сэрца, мае патрэбныя якасьці для заснаваньня шчасьлівага сужэнства. І толькі тады, калі знойдзе пазытыўны адказ на гэтае разважаньне, можа паважна адчыніць сваё сэрца.

Яшчэ адна заўвага: Малады чалавек можна паважна думаць аб сужэнстве, калі дарос да гэтага. Лекары падаюць час для дзяўчат 22-23 гады, для хлапцоў крыху больш. У гэтых гадох фізычнае і духовае разьвіцьцё на толькі аформілася, паколькі гэтага вымагае мацярынскі і бацькаўскі стан. Ранейшае сужэнства псуе недакончаны працэс разьвіцьця і можа ў жанчыны спрычыніць перадчасную старасьць.

Вышэй успаміналася, што пры добрых адносінах двох сем'яў можа здарыцца, што двое людзей могуць з сабою пазнаёміцца з мэтай будучага сужэнства. У такім выпадку ня можна рабіць закіду маладой пары, абы толькі яны трымаліся ў межах чэснае прызваітасьці. Часам падобныя адносіны могуць быць маральнай апорай і абаронай у спакусах.

Заручаныя павінны зрабіць моцную пастанову, што да аўтара яны прыступяць у стане беззаганнае чыстасьці, каб гэтым сьцягнуць на сваё сужэнства Божае багаславенства. На маладым чалавеку ляжыць абавязак чэсьці, паўстрымоўваць гоны сваёе натуры, каб нявіннасьць яго каханас ня сталася ахвяраю гэтых гонаў. Час ад часу ён павінен сабе прыпомніць, што забыцьцё можа стацца крыніцай горкіх дакораў сумленьня і ствараць паважныя перашкоды для Божага багаславенства іхняга будучага сужэнства.

Аднак наймацнейшая пастанова можа захістацца і ўпасьці, калі яе сторажам ня будзе разважнасьць. Як ужо няраз успаміналася вышэй, плоцьныя гоны нахабна папіхаюць да апошніх межаў. Пусьціцца на гэты шлях, а пасьля затрымацца на паўдарозе — гэта на даўжэйшы час пераўышае людзкія сілы. Таму сьведамае падпарадкаваньне сваіх пачуцьцяў розуму і хрысьціянскай маралі ёсьць неабходнаю ўмоваю, калі закаханыя жадаюць прыступіць да парогу сужэнства чыстымі так, як Бог загадаў.

Аб тым, што спатканьні заручаных сам на сам выстаўляюць іхнюю чыстасьць на вялікую небясьпеку, лішне нават і ўспамінаць. Дзеля гэтага такія спатканьні забараняе хрысьціянскі звычай і маладыя не павінны ўважаць гэтага звычаю за нешта такое, што іх абцяжвае, але тое, што ім дапамагае і бароніць перад упадкам, бо прысутнасьць іншых заўсёды дзейнічае паўстрымоўліваючы. Заручаныя не павінны падарожнічаць адны, а прагулкі зразумела могуць рабіць, але толькі ў людныя мейсцы.

Вось снапок думак і радаў для маладога чалавека. Рады гэтыя павінны стацца пакажчыкам пры выбары сяброўкі жыцьця і як з ею паводзіцца. Але толькі той здолее імі карыстацца, у каго кіруючую ролю ў жыцьці наагул, а ў плоцьных адносінах у асаблівасьці, мае дух. Ня дай Божа ў ім узялі верх сьляпыя гоны, тады яны яму знойдуць сяброўку жыцьця паводля іхняга смаку. Гэта было-б вельмі рэдкае здарэньне, каб падобны выбар прынёс чалавеку шчасьцё.

З надзеяй на будучыню і ацэньваючы належна веліч свае пастановы, малады чалавек павінен аформіць сваю волю наступна: Як вада быстрае ракі зьбіраецца ў рэчышчы і сваею плыньню па дарозе парушае млынавыя і электрычныя турбіны, стаючыся праз гэта паважнаю крыніцаю сьвятла і энэргіі, так і плоцьныя гоны людзкое натуры, ўнятыя ў рамы хрысьціянскае навукі і цнотаў, стаюцца дзейнікам выкананьня Божых плянаў у сужэнстве. Таму трэба сьцерагчы гэтых плянаў, каб нядобрыя людзі, распусныя кніжкі і тэатры ды іншыя падступныя нагоды іх ня зьнішчылі і не павялі чалавека на бездарожжа. Трэба стацца валадаром сваіх пачуцьцяў, а ня іхным слугою!

(Працяг будзе).

Паводля кніжкі Шільгена «Du und Sie»
апрацаваў **Васіль Друя.**

Бог карае завідушчых

(Беларуская народная казка).

Была адна багатая кабета; быў у яе сын. Матка была скупая і злая, а сын добры і міласэрны; матка дужа ня любіла ўбогіх, а сын, што толькі мог аддаваў убогім. Чэраз усё сваё жыцьцё гэтая кабета толькі адзін раз падарыла ўбогага. Было гэта так. Кабета палола ў гародзе цыбулю; ішоў убогі і стаў прасіць у яе цыбулі. Кабета стала на яго крычаць і гнаць вон. Убогі ня йдзе, а яшчэ жаласьней стаў прасіць. Кабета бачыць, што ад яго не адчэпішся, — вышчыкнула тры перынкі цыбулі і кінула яму іх праз плот. Убогі падзякаваў і пашоў.

Памерла гэтая кабета: надта-ж ёй трудна было ўміраць. Сын знаў, што і на тым сьвеце матцы будзе трудна. І стаў ён раздаваць матчына дабро ўбогім, даваць на цэрквы і касьцёлы, служыць абедні па яе душы... Раздаў усё багацтва і сам стаў убогім.

Прышла пара і сын памёр. На тым сьвеце ён папаў у рай. Маткі ў раю не нашоў. Няма ў раю, дык пэўна ў отхлані, ці ў пекле. Раз хадзіў сын па раю і падышоў к маленькай зямлянцы; дзьверы ў зямлянку толькі лычком завязаны. «Што тут такое ёсьць?» думае ён сабе. Разьвязаў лычко, увайшоў у зямлянку. Бачыць стаіць кацёл з гарачай смалой, а ў смале смажацца грэшнікі; паміж імі і яго матка. І гаворыць яму яго матка: «Сынок мой, ты відзіш куды я папала. Ты ўгодны Богу, вызвалі мяне адсюль!» Сын пашоў, заплакаўшы да Бога; стаў прасіць Бога вызваліць яго матку з пекла. І кажа яму Бог: «Няхай яе вызваляць яе дары. Дароў я яе ўсяго тры цыбулінкі, што яна калісьці дала ўбогаму». Узяў Бог гэтыя тры цыбулінкі і зрабіў з іх ланцужок. І кажа Бог сыну: «Папрабуй выцягнуць гэтым ланцужком сваю матку з пекла». Прышоў сын к пеклу і перасказаў сваёй матцы, што яму Бог казаў; потым падаў ёй адзін канец ланцужка, а сам за другі трымае. Стаў падымаць... Убачылі гэта другія грэшнікі і яны схапіліся за яе. Цыбульны ланцужок ня рвецца. Сын ужо радаваўся, што вызваліць матку з пекла, аж тут матка закрычала на другіх грэшнікаў, што трымаліся за яе: пашлі вон!.. бачыш якія вы разумныя: за чужыя дары хочаце з пекла вылезьці!..»

Ланцужок — троп! і парваўся. Матка зноў вярнулася ў смалу.

А ўсё праз сваю зайздрасьць.

(Паводля А. Е. Багдановіча. Шэйн — Том 2. стр. 363).

УРАЖЭНЬНІ З АЎСТРАЛІІ

Беларусам раскіданым па цэлым сьвеце напэўна цікава ведаць, як жывуць людзі ў іншых краінах і як там жывуць беларусы. Маючы некалькі вольных хвілінаў, хачу падзяліцца з чытачамі «Божым шляхам» аб сваіх уражэньнях з Аўстраліі (правінцыі Нов. Паўдз. Валіі).

Эўрапэйцу кідаецца адразу ў вочы, што ў Аўстраліі ўсё інакшае: іншы тут зьвярыны і расьлінны сьвет. Тут нідзе не пабачых такіх лясоў, як у Эўропе: дрэвы тут рэдкія, быццам насаджаныя; трава і зельле не такое лапашыстае, як мы прывыклі бачыць на Беларусі; мурожнае травы ня відаць нідзе. Птушак тут шмат, але такіх, што сьпяваюць здаецца няма. Тутэйшыя птушкі толькі крычаць, пішчаць, трашчаць; толькі жабы тутэйшыя галасістыя, як і нашы. Здавалася мне адразу, што тут няма вераб'ёў, але вось быў у горадзе і ўбачыў іх: ёсьць верабейчыкі гэткія-ж, як і нашы сварлівыя і непаседлівыя. Але малайцы вераб'і, ані чуць не асыміляваліся, хоць мо ўжо сотае пакаленьне выводзіцца ад тых, што калісь правезьлі з Эўропы. Зусім не перанялі, ані голасу, ані манераў аўстралійскіх птушак; каб гэта Бог даў нашым людзям узяць прыклад з верабейчыкаў.

Статку тут шмат, асабліва кароў і авец. Выглядаюць яны добра. Магчыма гэта таму, што на кожную карову тут адводзіцца пашы ня менш 100 га. Хлявоў для статку тут няма — круглы год ходзяць на пашы.

Глеба тут добрая, збожа расьце добра, але ў параўнаньні да агульнага абшару ворнае глебы надзвычайна мала.

Працуюць аўстралійцы не сьпяшаючыся, і калі нашыя эмігранты пачынаюць рабіць эўрапэйскім тэмпам, дык мяйсцовыя работнікі на гэта глядзяць крыва. Работы тут многа і заработкі добрыя, толькі бяда з памешканьнем.

Вялікая колькасьць аўстралійскіх работнікаў нежанатыя, хоць і пажылыя. Працуюць тут усяго 5 дзён на тыдзень і шмат хто за суботу і нядзелю прапівае свой тыднёвы заработак. Магчыма дзеля гэтага і ня жэняцца, бо жонка магла-б ня даць грошаў п'янстваваць. Але агулам аўстралійцы людзі добрыя і ветлівыя. Першае, што аўстраліец пытае эміграната, гэта: «Як вам падабаецца Аўстралія?» Тады сьцеражыся, каб не сказаць, што нешта непадабаецца, можа ўся ветлівасьць прапасьці.

У гарадох у суботу да палудня вялікі рух, а ў нядзелю ўсюды цішыня; нават сталоўкі і кіна пазачыняты, — людзі або сядзяць дома, або ку-

ды небудзь выязджаюць, асабліва любяць прыглядацца да конскіх перагонаў; нават 80-гадовыя бабулькі там бываюць.

Што да рэлігійнага жыцьця, дык каталікі ў Аўстраліі зарганізаваныя даволі добра. У кожным большым ці меншым гарадку маюць свае сьвятыні, мужчынскія і жаночыя манастыры, а пры іх школы. Каталіцкае прыватнае школьніцтва пастаўлена добра. Пры школах ёсьць інтэрнаты. Цікава, што ўва ўсіх аўстралійскіх школах і дзяржаўных і прыватных ужываецца розга. Каталіцкія сьвятыні ў нядзелі і сьвяты запаўняюцца вернікамі і выглядае так, што ўсё добра, але як гэта доўга ўдасца затрымаць ў моры абыякавых? Сьвятыняў іншых веравызнаньняў таксама многа, але ў шматлікіх нават дарожкі ўходу пазарасталі травою. Так у каталіцкіх, як і пратэстанцкіх ды англіканскіх сьвятынях у большых гарадох ёсьць добрыя хоры, якія часта выступаюць у радыё.

Гэта было-б добра, каб ня было ў кожным гарадку нязьлічаных «бараў» ды «гатэляў» заўсёды поўных. П'юць тут пераважна піва; п'юць і мужчыны і жанчыны, а нават і дзяўчаты. Піва тут вельмі ап'яняючае, а віно дык хіба са сьпіртам, такое моцнае.

Нашы ДП, за малым выняткам трымаюцца неспадзевана добра; зробленыя грошы складаюць у банк, каб пасьля магчы купіць якую нярухомасьць, а ёсьць ужо такія, што пакуплялі сабе пляцы пад будову, а некаторыя нават хаты пакуплялі.

Аўстралійскі ўрад выказвае задаваленьне з новае эміграцыі. Але зразумела, што ня ўсе аўстралійцы задаволеныя намі. Пару месяцаў таму якісьці гэнэрал дамагаўся ад ураду, каб забаранілі эмігрантам і выдаваць і нават выпісваць з іншых краінаў газэты і кніжкі ў іхных родных мовах. У некаторых газэтах былі артыкулы, аўтары якіх дамагаліся забараніць эмігрантам у будучыні будаваць дамы пасвойму. У месьце Вудвіл адзін раднік абураўся нават на самую думку, каб эмігранты будавалі нешта ў сваім стылю, бо гэта псавала-б ягоны добры настрой. Ёсьць так-жа некаторыя саюзы работнікаў, як чытуначнікі, вуглякопы, маляры, якія ня прымаюць эмігрантаў у сябры сваіх саюзаў, пазбаўляючы тым самым эмігрантаў лепш платных мейсцаў працы. Да гэтага часу ўрад на такія галасы не зьвяртаў увагі. Каталіцкія ерархі з свайго боку выдалі супольны ліст з заклікам да аўстралійцаў добра адносіцца да новых эмігрантаў (новааўстралійцаў). Можна дагадвацца, што няпрыхільнасьць да новае эміграцыі сеюць камуністы ды іхныя прыхільнікі ў некаторых кругох работнікаў.

Перад выездам у Аўстралію некаторых палохае двугадовы кантракт, які забавязвае кожнага эміграната адпрацаваць 18 месяцаў на вызначаным мейсцы і гэтым пазбаўляе свабоды выбару працы. Калі аднак добра разглянуцца на мейсцы, дык паказваецца, што ён карысны для тых, хто ня ведае ангельскае мовы і тутэйшых звычаяў. Бо кантрактам зьвязваецца ня толькі эмігрант, але і ўрад, каторы мусіць даць працу, памешканьне і ўсё неабходнае для эміграната і ягонае сям'і. Ёсьць выпадкі, што людзі, якія прыехалі сюды без кантрактаў (маючы больш за 50 г.) і працуючы ў аднаго пратэстанцкага пастара 3 месяцы, ня толькі нічога не зарабілі, але былі доўжныя яму 12 фунтаў шт.

Адносна беларускага арганізацыйнага жыцьця, дык думка аб заснаваньні беларускае арганізацыі ў Аўстраліі была ўжо ў першых эмігрантаў і на караблі праектаваўся тымчасовы Беларускі Камітэт. Аднак вялікая расьцярушанасьць і невялікая колькасьць беларусаў спачатку не давала магчымасьці аформіць і ажыцьцявіць арганізацыйную працу. Толькі на пачатку гэтага году ў сталіцах правінцыяў: Вікторыі, Новай Паўдз. Валіі і Паўдз. Аўстраліі ўжо заіснавалі беларускія арганізацыі. Крыху пазьней у сталіцы прав. Квінслянду-Брісбэне так-жа паўстала беларуская арганізацыя. Акрамя таго ў Мэльбурне залажыўся беларускі Клюб, а ў Адэляідзе заснавалася беларуская праваслаўная арганізацыя і царкоўны хор. Да гэтага часу Беларускае Аб'еднаньне ў Сыднэі (прав. Новая Паўдз. Валія) залегалізавала свой статут, наладзіла сьвяткаваньне 25-III, удзельнічала ў выстаўцы новааўстралійцаў і выдае свой інфармацыйны бюлетэнь «Новае жыцьцё». Ёсьць надзея, што арганізацыйная праца ў далейшым будзе разьвівацца памысна.

Трэба зазначыць, што ў правінцыі Зах. Аўстраліі жыцьцё мае зусім адменны выгляд, ад таго, як тут апісана. Блізкасьць пустыні Калахары там бачны і ў жывой і ў няжывой прыродзе на кожным кроку. Гэты подых пустыні ў беларусаў выклікае несамавітае ўражэньне. Адзін наш суродзіч піша адтуль: «Тут такая пустыня, што кругом толькі скалы; ня горы, а так узгоркі шмат, дзе зусім голыя і дзе-ні-дзе якіясь дрэвы быццам нашыя вербы. Як вокам сягнуць ані птушкі, ані якога зьвярка, акрамя трусоў, нідзе няма. Ані рэчкі, ані возера. Ані гарадоў, ані фабрыкаў, ані фэрмаў. Жара даходзіць да 55°, у нас на Беларусі ў найгарачэйшае лета такое гарачыні няма. Жывём у бараках, яду маем добрую, але яна ня лезе ў рот».

Агулам трэба заўважыць, што пагляды на жыцьцё эміграцыі ў Аўстраліі можна пачуць розныя: гэта залежыць ад таго, ці будзе гаварыць звычайны работнік, ці інтэлігэнт. Тымчасам інтэлігенцыя з новае эміграцыі можа знайсьці працу толькі чорнарабочага, ды ня відаць і пэрспэктываў, што гэтае «тымчасам» зможа хутка зьмяніцца на нешта лепшае, аднак ня выключаная рэч, што і такая магчымасьць некалі можа здарыцца.

Я. А.

НА РЭЛІГІЙНАЙ НІВЕ

РЭЛІГІЙНЫЯ АДНОСІНЫ Ў КАРЭІ.

Сучасныя ваенныя падзеі ў Карэі зрабілі гэтую краіну прадметам агульнага зацікаўленьня. Але адначасна побач ваенных падзеяў не апошняе мейсцы ў Карэйскіх падзеях займаюць рэлігійныя справы. Весткі, якія даходзяць з занятых камуністамі абшараў, адназгодна сьцьвярджаюць, што ўсьлед за камуністычнаю ўладаю ідзе прасьледаваньне Каталіцкае Царквы ў Карэі. Карэйскае насельніцтва (к. 21 мільёнаў) ў асноўным буддысты з невялікім процэнтам шынтаістаў. Эвангелізацыя краіны датуецца толькі ад 1787 г., але пазьнейшыя жорсткія прасьледаваньні, якія амаль без перапынку трывалі да 1844 г., вынішчылі хрысьціянства ў Карэі так, што эвангелізацыю трэба было распачынаць з нічога нанова ў вельмі цяжкіх абставінах. Гэтым тлумачыцца, што цяпер у Карэі было ўсяго 133.000 каталікоў. Камуністычная ўлада аднавіла прасьледаваньне Каталіцкае Царквы паводля тыпічна бальшавіцкіх мэтадаў, стараючыся хаваць усе свае ганебныя ўчынкі. Яшчэ летась у паўночнай Карэі быў арыштаваны Я. Экс. Боніфацій Заўэр із 122 місыянерамі і мяйсцовымі сьвятарыі. Доля гэтых сьвятароў няведамая, а Экс. Заўэр памёр у турме яшчэ летась у жніўні. Цяпер у занятых камуністычнымі войскамі абшарах паўдз. Карэі арыштоўваюць каталіцкіх місыянароў і мяйсцовых каталіцкіх карэйскіх сьвятароў і гэта ўсё мае быць у «імя вольнасьці».

ПРАСЬЛЕД КАТАЛІЦКАЕ ЦАРКВЫ Ў РУМЫНІІ.

Пасьля арыштаў усіх каталіцкіх япіскапаў усходняга і лацін. абраду ў Румыніі камуністычны ўрад нядаўна арыштаваў гэнэральнага вікарага дыяцэзіі Альба Жулія пралата Людовіка Бога. Гэта быў апошні прадстаўнік каталіцкае ерархіі ў Румыніі.

ЧЭХАСЛАВАЦКАЯ ЛЕГАЦЫЯ ПРЫ ВАТЫКАНЕ ЗЬЛІКВІДАВАНА.

Пасьля выгнаньня ўсіх ватыканскіх прадстаўнікоў з Чэхаславаччыны камуністычны ўрад нядаўна закрыў сваю легацыю пры Ватыкане. Варта ўвагі, што пры гэтым чэхаславацкі ўрад нават не паведаміў Ватыкан аб сваім кроку. Такое скрытае дзеяньне сьведчыць аб намеры камуністычнага ўраду прасьледаваць далей у сябе Каталіцкую Царкву.

ЛІКВІДАЦЫЯ МАНАСТЫРОЎ.

Згодна з намечаным плянам чэхаславацкі камуністычны ўрад сёлета ў травені пазачыняў большую колькасьць каталіцкіх манастыроў у Славаччыне, а манахаў павывозіў у канцэнтрацыйныя лягэры.

НОВЫ СЭРБСКІ ПАТРЫЯРХ.

Дня 7-V г.г. памёр сэрбскі праваслаўны патрыярх Гаўрыіл. Зразумела, што пасьля гэтага ўва ўсім сьвеце было вялікае зацікаўленьне, хто зойме патрыяршы пасад у дзяржаве Тіто. Два сынодыя югаслаўскае Праваслаўнае Царквы не маглі выбраць патрыярха дзеля нястачы вымаганага кворум на сынодзе. Адначасна камуністычная ўлада так-жа не дармавала. Была праведзена акцыя, каб скампрамітаваць найбольш стойкага мітрапаліта Ёсіфа Скаплянскага: праводзіліся допросы аб японым адношаньні да калішніх каралеўскіх чэтнікаў. І вось на трэцім выбарчым сынодзе патрыярхам выбраны яп. Вікентій Праданові быўшы яп. Злетовско-Струміцаўскі.

НОВЫЯ СЬВЯТЫЯ.

Цяперашні Сьвяты Год між іншымі асаблівасьцямі вызначаецца яшчэ і тым, што ўжо адбылося многа бэатыфікацыяў і кананізацыяў і яшчэ шмат ёсьць на парадку дня, але між усімі кананізацыямі, якія сёлета адбыліся і маюць яшчэ адбыцца, найбольш урачыстым было прагалошаньне сьвятою Марыі Горэтті — 12-і гадовае мучаніцы, папулярна называнае анґелам дваццатага веку.

Мала ёсьць так узрушаючых гісторыяў, як кароткая і простая гісторыя жыцьця сьв. Марыі Горэтті. Радзілася яна 16-X-1890 г. у беднай але пабожнай сялянскай сям'і каля Анконы (Італія). Каб пракарміць сваіх шасьцёра дзяцей, бацька мусіў кінуць сваю маленькую гаспадарку і пераехаць з усею сям'ею на працу да абшарніка недалёка г. Нэттуно, але там хутка ўмірае. Дзевяцігадовая Марыя стаецца сіратою і мусіць памагаць маці, каб пракарміць сваіх малодшых сясьцёр і братоў. Сьціплая, але працавітая, прыгожая і пабожная Марыйка зьвяртае на сябе агульную ўвагу, але адначасна на яе пачынае кідаць вокам разбэшчаны 18-і гадовы сын гаспадара. Не зважаючы на яе маладосьць, ён пачынае намаўляць яе да граху, а пачуўшы катэгарычную адмову, пагражае рознымі карамі. Пагрозы паўтараліся некалькі разоў, але Марыя заўсёды мае адзін адказ, што лепш умерці, чым допусьціцца граху. Гэтыя няўдачы давялі маладога распусьніка да лютасьці і дня 6-VII-1902 г., напасьнік паўтарае яшчэ раз свае дарэмныя пагрозы і атрымаўшы рашучую адмову, ён нажом аж трынаццаць разоў прабівае малую Марысю.

Сьмяротна раненая і сьцёкшая крывёю, яна ўмёрла назаўтра ў шпіталю. Перад сьмерцю яна

не наракае ані на боль, ані на цярпеньні, ані на забойцу. Прымае з ангельскаю пабожнасьцю Сьвятыя Тайны і на пытаньне сьвятара: ці даруе свайму забойцу, кажа заміраючым голасам: «Я яму дарую, як Хрыстос дараваў сваім катам і хачу, каб ён пакаяўся і мог пайсьці ў рай».

Забойцу засудзілі на 30 гадоў, а магіла Марыі была ў агульнай пашане ня толькі ўсяе ваколіцы, але сталася ведамаю ўва ўсім сьвеце, бо ад яе разыходзілася дзіўная цудадзейная сіла. Забойца яшчэ ў турме публічна пакаяўся і адбыўшы скарочаную кару стаўся пакутнікам.

У 1947 г. Марыя Горэтті была абвешчана блажэннаю. Больш чым усякія паадзіночныя цуды, яе цудадзейны ўплыў зазначыўся на моладзі. Дзеля гэтага хутка закончыўся яе кананізацыйны працэс і ў найбольш урачыстай форме сёлета 24-V Марыя Горэтті была абвешчана сьвятою. Гэтая падзея суправаджалася вельмі рэдкім фактам: у часе калі Сьвяцейшы Айцец Пій XII чытаў кананізацыйны дэкрэт, перад абразом новае сьвятое ляжалі крыжам: родная маці сьвятое Марыі — Асунта Горэтті, родны брат Марыі — Анжэло Горэтті і яе забойца, а цяпер пакутнік — Аляксандар Сэрэнэльлі. Наплыў паломнікаў у Рым на ўрачыстасьць кананізацыі перайшоў усякія спадзяваньні. Сапраўды ня ўцяміць ніколі чалавек шляхоў Божага Праўду: калі бязбожная прапаганда пасылае ў Італію нязьлічаныя кадры вышкаленых прапагандыстаў, каб разбурыць каталіцкія падставы хрысьціянскага сямейнага жыцьця і разбэсьціць моладзь, тады зьяўляецца на аўтары вясёлая дзяўчынка і сваім прыкладам прыцягае зноў да Хрыста палкія і шчырыя сэрцы моладзі.

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА

БАЦЬКАЎШЧЫНА.

Перамяшчэньне савецкіх ерархаў.

Савецкія «праваслаўныя» ерархі ў Горадзенскай епархіі чаргуюцца з вялікаю хуткасьцю. Яп. Паісій (Образуев) назначаны летась на мейсца яп. Варсофонія, сёлета ў студзені звольнены на пакой, а кіраваньне епархіяю даручана менскаму архіяп. Пітірыму (Свірідову). Магчыма гэтыя зьмены выясьняюцца тым, што ў Горадзенскай епархіі (у Жыровічах) знаходзіцца адзіная на ўсю Беларусь і Прыбалтыку «Духоўная Сэмінарыя», а з усіх ерархаў на Беларусі найбольш савецкім чалавекам ёсьць арх. Пітірым. Ён мае найбольш давер у савецкіх уладаў у Маскве і падчас сабору з нагоды 500 годзьдзя аўтакефаліі расейскае Царквы яму была даручана вялікая група замежных дэлегатаў у часе агляданьня Масквы, ён-жа зьяўляецца савецкім ордэнаносцам, мае мэдаль «За доблестный труд».

а. др. Кулак засуджаны на сьмерць?

Шырокаведамы беларускі каталіцкі духоўны дзеяч а др. Кулак, які шмат цярпеў за сваю беларускасьць ад польскіх уладаў, з прыходам бальшавікоў на Беларусь, быў вымушаны перанесьціся ў Жэшоўскае ваяводзтва, але і там не пакінулі яго ў супакою. Як паведамляе польская газэта «Пляцувка» Нр. 4(79) з дня 3-II-1950 у кароценькай зацемцы, сёлета ў студзені месяцы а. др. Кулак разам з двумя польскімі сьвятарамі меў быць засуджаны на сьмерць польскім судом быццам за помач партызанам.

АНГЛІЯ.

Між праваслаўнымі.

Падчас свайго пяцітыднёвага прабываньня ў Англіі яп. Васілі (Тамашчык) пасьвяціў у сьвятары А. Крыта, каторы пражывае ў Галіфакс і мае абняць душпастырства над праваслаўнымі беларусамі ў Англіі.

На прэсавай ніве.

«Беларус на чужыне» Нр. 18(42) падаў кароткае разьвітальнае слова да сваіх чытачоў, але адначасна ў Лёндане зьявіліся новыя, хоць і ня зусім пэрыядычныя выданьні: Беларускі Незалежніцкі Народна-Хрысьціянскі Рух пачаў выдаваць свой Бюлетэнь. Цэнтральная ўправа Беларускае Акадэмічнае Каталіцкае Арганізацыі «Рунь» такжа выдала першы нумар свайго бюлетэню пад назовам «Рунь». Абодва выданьні ратарныя.

Канфэрэнцыя старшынь і сакратароў ЗБВБ.

У Беларускім Народным Доме ў Лёндане падчас 27 і 28 траўня адбылася канфэрэнцыя старшынь, сакратароў і скарбнікаў акруговых і мясцовых адзьдзелаў ЗБВБ.

На праграму першага дня канфэрэнцыі зложыліся: вызначэньне камісіяў (праграмовае і арганізацыйнае) і рэфэраты: Я. Амор — «Прэса і выдавецтва»; Я. Пілецкі — «Заданьне беларускае эміграцыі; а. др. Ч. Сіповіч — «Сучаснае палажэньне ўцекачоў». Наступнага дня разгледжана праекты камісіяў аб: увядзеньні сяброўскіх легітымацыяў, садзеяньню рэгулярнай уплаце сяброўскіх складак і падтрыманьне часопісу «На шляху», арганізацыі дапамогі хворым сябром, прапагандзе беларускае прэсы і іншыя арганізацыйна-тэхнічныя справы.

Згуртаваньне Беларускіх Камбатантаў разьвіваецца.

Ня гледзячы на розныя цяжкасьці Згуртаваньне

не Беларускіх Камбатантаў на абшары В. Брытаніі разьвіваецца памысна. Апошнім часам заложана два новыя адзьдзелы ЗБК у Ковэнтры і Бірмінгам. Стараньнем ЗБК у Лёндане дня 6-V была наладжана вечарынка. Цяпер адным з важнейшых заданьняў ЗБК ёсьць набольшыць лік сваіх сяброў.

З жыцьця БАКА «Рунь».

Беларускае Акадэмічнае Каталіцкае Аб'еднаньне ёсьць адною з малодшых арганізацыяў беларускае эміграцыі, бо заснавана толькі летась на агульным зьезьдзе ў Лювэне. БАКА гуртуе ўсіх студэнтаў і скончыўшых унівэрсытэцкія студыі беларусаў каталікоў. Цэнтральная ўправа тымчасам знайходзіцца ў Лёндане. Да гэтага часу вялася чыста ўнутраная арганізацыйная праца і падрыхтоўка да ўваходу ў сябры ведамае міжнароднае арганізацыі «Пакс Романа». Дня 17-VII Вэстмінстэрскае Архібіскупства зацьвердзіла статут Арганізацыі і гэтым самым зроблена нерадапошні крок да фармальнага прыняцьця ў «Пакс Романа».

Дакладнейшыя інфармацыі аб БАКА можна знайсьці ў бюлетэні «Рунь». З усімі запытаньнямі ў арганізацыйных справах БАКА зьвяртацца на адрас:

B. A. K. A. «Run», Marian House, Holden Avenue, London. N. 12. England.

Беларускі Выдавецкі Фонд у В. Брытаніі.

У выніку дагавору ўсіх беларускіх арганізацыяў у В. Брытаніі паўстаў Беларускі Выдавецкі Фонд, каб магчы выдаваць супольны часапіс. Коштам гэтага Фонду ўжо выдана друкам лістоўку аб Беларусі ў ангельскай мове і Нр. 9 «На шляху».

Працэсія ў Манчэстэр.

Сёлета 29-V адбылася ў Манчэстэр вялікая працэсія ладжаная ангельцамі. У гэтай працэсіі ўдзельнічалі беларусы, як асобная група з сваім сьцягам і плякатам. Для шматлікіх ангельцаў беларуская група была цікаваю неспадзеванкою, дык нічога дзіўнага, што беларусам прыходзілася даваць зацікаўленым шмат розных паясьненьняў і чуць частыя пстрыканьні фотоапаратаў.

АРГЭНТЫНА.

Трэці Агульны Зьезд Беларусаў у Аргэнтыне.

У памешканьні Згуртаваньня Беларусаў ў Аргэнтыне (ЗБА) у Буэнос Айрэс дня 28 травеня адбыўся трэці з чаргі Зьезд названае арганізацыі. Адкрыцьцё Зьезду папярэдзіла Служба Божая, якую адправіў у салі ЗБА а. Васілі Вячорка, прыгожа сьпяваў хор пад кіраўніцтвам І. Гейхроха. Пасьля багаслужэньня адчыніў Зьезд старшыня ЗБА К. Мерляк, прывітаўшы ў кароткіх словах усіх прысутных, пасьля чаго выбрана Прэзыдыю Зьезду.

Перад распачацьцем парадку дня ўшанована хвілінаю моўчанкі памяць вызвольніка Аргэнтыны гэнэрала Хозе дэ Сан Мартін. Наступна старшыня ЗБА К. Мерляк здаў справаздачу з дзейнасьці Згуртаваньня Беларасаў у Аргэнтыне за мінулы год. Пасьля здаў справаздачу скарбнік М. Ланкевіч з грашовае гаспадаркі Арганізацыі. За ім Ул. Другавец адчытаў пратакол з рэвізіі Нагляднае Рады, у якім сьцьвярджалася, што каса і агульная дзейнасьць ЗБА знойдзена ў парадку і прапануе ўступаючай управе даць абсалюторыю. У зьвязку са справаздачамі адбылася жывая дыскусыя, пасьля чаго аднагалосна удзелена абсалюторыю ўступаючай управе.

З чаргі Зьезд выбраў новую ўправу, у склад якое ўвайшлі: старшыня — К. Мерляк, сябры ўправы — Карпочіч Зося, Юзэфовіч Г., Ланкевіч М. і Другавец Ул. У Наглядную Раду выбрана: Гейхрох А., Карповіч А. і Налійко М.

Далей былі парушаныя справы: зьмены статуту ЗБА, пляну працы і ін.

Ўканцы выслана тэлеграму Прэзыдэнту Аргэнтыны. Закончыўся Зьезд агульным адсьпяваньнем Нацыянальнага Гымну.

Аб тым, што гэты Зьезд мае важнае значэньне для беларускае эміграцыі ў Аргэнтыне можа сьведчыць той факт, што наступнага дня старшыня ЗБА К. Мерляк атрымаў з канцыляры Прэзыдэнта Аргэнтыны вельмі прыхільны адказ на тэлеграму, высланую Зьездам папярэдняга дня.

ВАТЫКАН.

БЕЛАРУСКІЯ РАДЫЁПЕРАДАЧЫ.

Беларускія радыёперадачы з Ватыканскае Радыёстанцыі на тых хвалях, аб якіх мы паведамлялі перш, увесь час былі вельмі заглушваныя якоюсь варожаю станцыяю. Цяпер пераведзена беларускія радыёперадачы Ватыканскага Радыё на іншыя хвалі: кароткія хвалі: 19,87; 25,55; 31,10; і на сярэдніх 202 мэтры кожнае пятніцы а гадз. 18,30.

КАНАДА.

Другі Агульны Зьезд ЗБК

Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе сёлета ў днёх 27 і 28 траўня ў Торонто адбыло другі раз за час свайго існаваньня Агульны Зьезд.

Галоўнаю тэмаю Зьезду было надаць ЗБК такую форму арганізацыі, каб даць магчымасьць увайсьці ў сябры Згуртаваньня ўсім нацыянальна сьведамым беларусам, ня гледзячы на іхныя палітычныя погляды, дзеля гэтага падчыркнута поўную апалітычнасьць згуртаваньня. Але андачасна Зьезд падчыркнуў сваё непахіснае стано-

вішча на грунце 25 сакавіка і задэкляравау сваё супрацоуніцтва з усімі беларускімі арганізацыямі, якія імкнуцца да зьдзейсьненьня гэтага акту.

На старшыню Згуртаваньня выбрана Ал. Грыцука.

Беларускі Канцэрт.

З нагоды другога Зьезду ЗБК беларусы Торонто зарганізавалі у салі Украінскага Нард. Дому першы беларускі канцэрт у Канадзе. На канцэрце выступау новазарганізаваны беларускі мяшаны хор пад кіраўніцтвам сп-ні Мігай і танцавальная група, якая пад кіраўніцтвам сп-ні Пашкевіч выканала Лявоніху і Крыжачок. Былі такжа дэклямацыі. Канцэрт зрабіу на прысутных вельмі добрае уражэньне.

Антыкамуністычная маніфэстацыя.

У сувязі з 20-мі угодкамі расправы над украінскімі патрыётамі, адбылася у Торонто аграмадная маніфэстацыя, у якой, на знак брацкае салідарнасьці, удзельнічала так-жа беларуская дэлегацыя з сваім сьцягам.

Праваслауная беларуская парахвія.

У Торонто праваслауныя беларусы зарганізавалі сваю парахвію. Сьвятаром зьяуляецца а. М. Мігай. Багаслужэньні адбываюцца кожнае нядзелі і сьвята на Коледж Стріт.

Адведзіны Беларускіх Цэнтрау.

Як паведамляюць з Канады у другой палавіне ліпеня старшыня Рады БНР інж. М. Абрамчык адведау Торонто і іншыя цэнтры беларускае эміграцыі у Канадзе.

НЯМЕЧЧЫНА.

Апека над старымі.

Усе старэйшыя эмігранты у веку па-над 60 гадоу, маючы статус ДП і пражываючыя да гэтага часу у Нямеччыне і Аустрыі, якія ня маюць магчымасьці выэміграваць у іншыя краіны, могуць быць прынятыя у дамы для старцау у Францыі і Бэльгіі. Зацікауленыя гэтаю справаю беларусы хай зьвяртаюцца у Нямеччыне на адрас: Weissruthenisches Caritasdienst in Deutschland: (20b) GOSLAR/Harz, Sommerwohlenstr. 1. A., Germany, Brit. Zone.

Каб унікнуць непатрэбнае пісаніны, просіцца усіх зацікауленых адразу падаваць поунасьцю сваё імя і прозьвішча, дату і мейсца нараджаньня і цяперашні адрас.

Рэдакцыя «Божым шляхам» выкарыстоувае пры гэтым нагоду, каб прыпомніць сваім чытачом і падпішчыкам на абшары Нямеччыны, што аплату за часапіс і ахвяры на выдавецкі фонд Добрае Кніжкі можна слаць на вышэйпаданы адрас.

Ліквідацыя лягэрау.

У зьвязку з масаваю эміграцыяю з Нямеччыны уканцы красавіка быу зьліквідаваны беларускі лягэр у Бакнангу. Нявыэмігравaушыя жыхары лягэру перавезены у лягэр Эльвангэн.

У чэрвені зьліквідаваны другі беларускі лягэр у амэрыканскай зоне — Розэнгайм. Жыхары гэтага лягэру часткава перанесены у Шляйсгайм, часткава у Бад-Кіссінгэн, толькі старыя і хворыя асталіся яшчэ у Розэнгайме. Управа Беларускага Нацыянальнага Камітэту перанесена у Мюнхэн.

Рэзалюцыя беларусау у лягэры Зээдорф.

Беларуская група у лягэры Зээдорф на сваім агульным паседжаньні зложаным з абедзьвех палітычных груповак дня 9 ліпеня аднагодна прыняла рэзалюцыю, якая сьцьвярджае, што прадстауніцтва БССР на міжнародным полі ня ёсьць ніякім прадстауніцтвам Беларускага Народу і дзеля гэтага Аб'еднаныя Нацыі не павінны лічыць голас дэлегатау БССР у справе ваенных падзеяу у Карэі, як і ува усіх іншых справах, за голас Беларускага народу. З свайго боку жыхары лягэру заяуляюць, што Беларускі народ заусёды стаяу у абароне свабоды, справядлівасьці і дэмакрацыі ды змагауся супраць гвалту, дыктатуры і прымусу, дзеля гэтага Беларускі Народ падтрымоувае заклік Аб'еднаных Нацыяу нясьці помач карэйскаму народу. Уканцы рэзалюцыя зазначае, што беларуская эміграцыя у патрэбе гатова з аружжам у руках выступіць да змаганьня супраць вызваленьня народау паняволеных расейскім імпэрыялізмам.

Ёсьць весткі, што іншыя беларускія групы нават у іншых краінах падтрымоуваюць аднагодна гэтую рэзалюцыю. Яна можа быць цьвярозым адказам беларускае эміграцыі на розныя заклікі і загады безадказных адзінак у гэтай справе.

УРАГВАЙ.

З жыцьця беларусау.

Сёлета у траўні прадстаунік ураду БНР у Аргэнтыне К. Мерляк адведау Урагвай, каб пазнаёміцца з тамтэйшымі беларусамі ды навязаць лучнасьць і супрацоуніцтва. Уражэньне з гэтых адведзін наагул сумнае. Большасьць беларусау пражывае у ваколіцах парагвайскае сталіцы Монтэвіедо; гэта старэйшая эміграцыя, з новае ня прыбыу ніхто. У Монтэвіедо ёсьць беларуская арганізацыя з двумя адзьдзеламі у ваколіцы гэтага гораду і мае назоу: «Беларускае Таварыства імені Максіма Горкага». Сам назоу гаворыць за сябе. Гэтая арганізацыя належыць да славянскага саюзу у Урагваю, які у сваю чаргу кіруецца савецкімі агэнтамі.

У памешканьні гэтага Таварыства знайходзяцца партрэты амаль усяе савецкае вярхоукі. Аднак прыглянуушыся уважней, маецца уражэньне, што тамтэйшыя беларусы паддаліся савецкай прапагандзе і парабіліся камуністамі не з перака-

наньня, а з прымусу і страху. У кіраўніцтве арганізацыяў спатыкаюцца ўсюды, згары накіненыя таёмнаю рукою, чужыя людзі, якія добра пільнуюць, каб беларусы ня зышлі на лінію «тітоізму». Напр., у ўправу адзьдзелу на Сэро ўвайходзіць адзін бэсараб і другі неакрэсьленай нацыянальнасьці, якія недапушчаюць, каб беларусы выломліваліся з намечанае лініі; супраць непаслушных прымаюць розныя меры, што ім удаецца лёгка, пры надужываньні вольнасьці, якая існуе ў Уругваі. З прыкладу беларускае эміграцыі ў Уругваі выяўляецца, што людзі, якія паддаліся камуністычнаму ўплыву трацяць вольнасьць ня толькі ў сябе на бацькаўшчыне, але і на эміграцыі.

ФРАНЦЫЯ.

Даклады.

З пачыну Парыскага Адзьдзелу Аб'еднаньня Беларускіх Работнікаў у Францыі час ад часу ладзяцца даклады для беларускае калёніі ў Парыжу. Сёлета 23-IV адбыўся даклад А. Кавалеўскага на тэму: «Жыцьцё і творчасьць М. Багдановіча», а 15-V а. Рэктар Беларускае Місіі меў даклад аб сьв. Еўфрасіні.

Другі Агульны Зьезд БНАМ.

Згодна з паведамленьнем дня 30-IV у салі Хрысьціянскага Сындыкату ў Парыжу адбыўся Другі Агульны Зьезд Беларускае Незалежніцкае Арганізацыі Моладзі ў Францыі. Пасьля справаздачаў управы і Рэвізыйнае Камісіі адбылася дыскусія аб праробленай працы і намечаны плян працы на бягучы год; абгаворана папраўкі некаторых параграфаў статуту і выбрана новую ўправу, ў склад якое ўвайшлі: старшыня — М. Наумовіч, заступнік старшыні — В. Забаўскі, сакратар — В. Міцкевіч, скарбнік — С. Бэус. Выбрана так-жа Рэвізыйную Камісію, Сяброўскі Суд і рэфэрэнтаў: культуры, спорту, прэсы, узаемадапамогі і сувязі з іншымі нацыянальнасьцямі.

Акадэмія ў 8-я ўгодкі сьмерці Я. Купалы.

З нагоды восьмых угодкаў трагічнае сьмерці вялікага беларускага песьняра Янкі Купалы дня 25-VI у беларускай капліцы пры царкве Сан-Сюльпіс пасьля Службы Божае была адслужана паніхіда за душу паэты, а папалудні таго-ж дня ў салі Хрысьціянскага Сындыкату ў Парыжу была наладжана акадэмія, на праграму якое злажыліся: рэфэрат аб жыцьці і дзейнасьці Я. Купалы, прачытаны В. Міцкевічам і пераплятаны дэклямацыямі адпаведных да зьместу рэфэрату вершаў. Закончылася акадэмія агульным адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гымну.

На міжнароднай ніве.

Сусьветны Рух Матак арганізаваў сёлета ў Парыжы ў днёх 6-11 чэрвеня міжнародны жаночы кангрэс для абмеркаваньня паважнае тэмы: «Маці работніца ў людзкім прагрэсе». Між шматлікімі дэлегацыямі вольных народаў у кангрэсе удзельнічала і беларуская дэлегатка ад імені Аб'еднаньня Беларускіх Жанчын на Эміграцыі ім. Цёткі і мела кароткі даклад аб сучасным цяжкім становішчы беларускае маткі.

Супольная ўрачыстасьць.

Адзьдзел АБРФ у Крэсо дня 28-5 ладзіў супольна з украінцамі ўспамін трагічна загінуўшых змагароў за волю сваіх народаў: Я. Купалы, І. Франка, С. Петлюры і Я. Коновальца. На салі былі партрэты ўспомненых людзей, былі прачытаны украінскія і беларускія рэфэраты, а ўканцы адсьпяваны нацыянальныя гымны. На ўсіх прысутных гэтае супольнае сьвяткаваньне зрабіла мілае ўражэньне.

ПОШУКІ:

180. Сваіх родных: **Пратасаву** Веру, **Пратасаву** Надзю з в. Грабе акр. Бабруйск, і знаёмых: **Короля** Івана, **Лісоўскага** Уладзімера — шукае **Раговіч** Філіп. Пісаць на адрас:

Mr. Rohowicz Fylyp, P. O. Box 172, Caprial, Ont. Canada.

181. **Плескачэўскага** Анатоля і **Плескачэўскага** Барыса з жонкаю і сынам Алікам, якія былі ў Нямеччыне да 1947 г., шукае Е. Гінтовт з Аўстраліі. Пісаць на адрас:

Weissruthenisches Caritasdienst in Deutschland: (20b) GOSLAR/Harz, Sommerwohlenstr. 1. A., Germany, Brit. Zone.

182. **Кособудзкага** Антона с. Данілы, які выехаў у Францыю к. 1925 г. і **Малаховіча** Пятра, шукае пляменьнік Яцэвіч Аляксандар. Пісаць на адрас:

Mr. Jacevisch Alexander, Santeny par Villecreusnes. (S. et O.).

НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД «БОЖЫМ ШЛЯХАМ».

Апошнім часам прыслалі:

Апанасёнак А. — 220 фр.; а. Б. С. — 6.900 фр.; Будзько Ч. — 2.640 фр.; Буката — 880 фр.; Бут-Гуссаім В. — 1.000 фр.; Кукель М. — 220 фр.; Кучынскі К. — 220 фр.; Лазоўскі М. — 440 фр.; Марозы М. і Н. — 330 фр.; Міцкевіч А. — 400 фр.; Мурашко Ю. — 500 фр.; Мэдыцкая А. 440 фр.; Мятла — 350 фр.; Мяцеліца М. — 500 фр.; Рагевіч Ф. — 384 фр.; Саўко Ул. — 660 фр.; Смайкевіч К. — 880 фр.; Хвалько Л. — 880 фр.; Цыбульскі Э. — 500 фр.; а. Ч. Ф. — 500 фр.; Шастак М. — 600 фр.; Юрчык Р. — 350 фр.; Якубовіч А. — 880 фр.

ЗЬМЕСТ:

Gérant : D. Kucopej. Directeur : Abbé L. Horosco.

Impr. de Navarre, 11, rue des Cordelières, Paris.